ТРАВЕНЬ - ЖНІВЕНЬ 2024
TRENDS.BELHELCOM.ORG

# ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ: АСНОЎНЫЯ ТРЭНДЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ

АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ | ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА | КЛЮЧАВЫЯ РЭАКЦЫІ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР



У 2024 г. AI становіцца не толькі больш «разумным», але і больш дасяжным для ўсё большай колькасці людзей. Каб прыцягнуць увагу аўдыторыі, мы генеруем малюнкі для вокладкі агляда з дапамогай AI і на падставе падзей, што адбываюцца ў Беларусі.

Больш за палову 2024 года не назіралася істотнага ўзмацнення легалізацыі рэпрэсій. Дзяржава, як кракадзіл, які «адкусіў» вялікі кавалак правоў і свабод у 2023 годзе і раней, «пераразўлівае» яго, засяродзіўшыся на ўнясенні неабходных змяненняў у ніжэйшыя акты ў пашырэнні спектру супрацьпраўных практык.

На малюнку, згенераваным Shutterstock.AI, кракадзіл выглядае нібыта расслабленым, але насамрэч застаецца небяспечным для ўсіх.

БЕЛАРУСКІ
ХЕЛЬСІНКСКІ
КАМІТЭТ

© Беларускі Хельсінкскі Камітэт, 2024

# ЗМЕСТ

**УВОДЗІНЫ** 5

**РЭЗЮМЭ** 7

**I. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДПАСЫЛКІ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ** 11

Пашырэнне легалізацыі сістэмных рэпрэсій 11

Спроба выправіць наступствы рэпрэсіўнай норматворчасці («пашпартнага ўказу») для самой сістэмы 13

Змена мераў сацыяльнай абароны дзяцей, якія ствараюць глебу для рэпрэсіўных дзеянняў і індактрынацыі 14

Узмацненне патэнцыялу сілавога апарату праз сістэму адукацыі і працаўладкавання 15

Узмацненне кантролю і ідэалагізацыя ў сферы адукацыі 17

Узмацненне мілітарызацыі 18

Вырашэнне пытанняў недахопу грашовых рэсурсаў і адтоку чалавечага капіталу праз парушэнне эканамічных і сацыяльных правоў 19

**II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА: ПАРУШЭННІ ГРАМАДЗЯНСКІХ, ПАЛІТЫЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВОЎ** 22

Змена паводзінаў рэжыму ў дачыненні да палітвязняў 22

Масавая замена пакарання ў выглядзе абмежавання свабоды без накіравання ў калонію на больш жорсткае 23

Выкарыстанне смяротнага прысуду ў палітычных мэтах 23

Новыя практыкі праследу па артыкулах аб экстрэмізме 24

Пашырэнне ўціску на працоўных месцах 25

Узмацненне ціску на сваякоў людзей, якія вымушаны з’ехаць за мяжу 26

Новыя практыкі і ўзмацненне пераследу людзей, якія вымушаны з’ехаць за мяжу 26

Чарговы віток рэпрэсій у дачыненні да людзей, звязаных з дэмакратычнымі сіламі 27

III. КЛЮЧАВЫЯ ЗМЕНЫ Ў РЭАКЦЫЯХ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР, ЯКІЯ ТЫЧАЦЦА СІТУАЦЫІ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ 28

Паўторны запуск Венскага механізму абсе ў дачыненні да Беларусі 28

# УВОДЗІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі застаецца прадметам маніторынгу і аналізу з боку беларускіх і міжнародных НДА і міжнародных арганізацый. З 2012 г. дзейнічае мандат Спецыяльнага дакладчыка па сытуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Таксама агляды падаюцца ў рамках альтэрнатыўных дакладаў грамадзянскай супольнасці ў дамоўныя органы, якія кантралююць выкананне асноўных канвенцый ААН у галіне правоў чалавека, а таксама ў дакладах саміх гэтых органаў. У сувязі з неабгрунтаваным ужываннем сілы, катаваннямі ў дачыненні да мірных пратэстоўцаў супраць сфальсіфікаваных выбараў у 2020 г. і распачатымі за імі рэпрэсіямі, у сакавіку 2021 г. быў заснаваны спецыяльны Мандат па сітуацыі ў Беларусі пад эгідай Вярхоўнага камісара ААН, які ў 2024 г. быў заменены групай незалежных экспертаў, што азначае большую самастойнасць і незалежнасць гэтага механізму.

З 2019 г. БХК разлічвае Нацыянальны індэкс па правах чалавека, у межах якога больш за 40 беларускіх экспертаў:к ацэньваюць змены асобна па кожным пункце каталога правоў чалавека. Беларускія НДА рэгулярна робяць профільныя маніторынгі сітуацыі з правамі чалавека, зыходзячы са сваёй спецыялізацыі.[1]

Спачатку падзеі 2020 года, пазней вайна ва Украіне і суўдзел Беларусі ў расійскай агрэсіі істотна змянілі становішча ў краіне, у тым ліку палітыку і практыку ў сферы правоў чалавека. Сітуацыя ўвесь час пагаршаецца: штодня становіцца вядома аб зменах заканадаўства, ініцыятывах уладаў,[2] канкрэтных парушэннях і г.д. У гэтым патоку інфармацыі **складана ўтрымаць фокус увагі**, размываецца мяжа паміж галоўным і негалоўным.

Каб не прапусціць найбольш значныя падзеі, лепш разумець сітуацыю ў Беларусі, і куды рухаецца дзяржава ў кантэксце вяршэнства права і правоў чалавека, мы адсочваем **найбольш значныя і якасныя змены асноўных трэндаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы правоў чалавека**.

Для гэтага з ліпеня 2023 года Беларускі Хельсінкскі Камітэт выпускае перыядычны агляд. Яго мэта - прадстаўляць нашыя экспертныя ацэнкі **найбольш значных і якасных змен у тэндэнцыях беларускай дзяржаўнай палітыкі** ў галіне правоў чалавека і рэакцыях на яе міжнароднай супольнасці за справаздачны перыяд па трох напрамках:

---

1 *Гл., у прыватнасці, Аналітычныя агляды сітуацыі з правамі чалавека, якія рыхтуе ПЦ «Вясна»: https://spring96.org/ru/publications; Агляды сітуацыі са свабодай асацыяцый і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці Рэспублікі Беларусь, якія робіць Lawtrend: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/ezhegodnyj-monitoring; маніторынгі і Электронныя бюлетэні СМІ ў Беларусі, якія робіць БАЖ: https://baj.media/ru/aglyady_category/monitoringi-bazh/ і інш*

2 *Мы маем на ўвазе, што цяперашнія ўлады ў Беларусі з'яўляюцца ўладамі дэ-факта.*

- *агульныя меры:* сістэмныя рэчы - заканадаўства, стратэгіі, палітыкі, якія ў цэлым вызначаюць умовы і перадумовы рэалізацыі правоў чалавека ў краіне;

- *праваапрымяняльная практыка:* тэндэнцыі парушэнняў грамадзянскіх і палітычных, сацыяльных, эканамічных і культурных правоў;

- *ключавыя рашэнні і рэакцыі міжнародных структур,* звязаныя з сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі.

Нашая аналітыка дапамагае лепш зразумець трэнды ў галіне правоў чалавека ў Беларусі (для міжнародных партнёраў - у прынцыпе лепш арыентавацца ў беларускім парадку дня), дае магчымасць адсочваць сістэмныя і якасныя змены сітуацыі, пашыраць праваачалавечны фокус аналітыкі ў сумежных галінах (палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і інш.), будзе карысная для выпрацоўкі стратэгій і пазіцый.

Аналітыка за 2023 г. прадстаўленая ў 2-х аглядах (за кожныя паўгода). Выпускі за 2023 г., а таксама зводную аналітыку за год у выглядзе інтэрактыўнай прэзентацыі можна знайсці тут.

У 2024 г. агляд выйдзе тройчы (па выніках кожных чатырох месяцаў). Выпуск за студзень-красавік 2024 г. можна знайсці тут.

**Вы можаце падпісацца на наш агляд тут**

ПАДПІШЫЦЕСЯ НА НАСТУПНЫ
ВЫПУСК ТРЭНДАЎ НА

TRENDS.BELHELCOM.ORG

# РЭЗЮМЕ

- Таксама, як і ў першым трыместры 2024 г., з мая па жнівень не назіралася значнага ўсплёску легалізацыі рэпрэсій з якаснымі зменамі. Відавочна, дзяржава, зрабіўшы вялікі скачок у такой легалізацыі ў 2023 г., «пераварвае» яе, засяродзіўшыся на ўнясенні неабходных змен у ніжэйшыя акты і пашырэнні спектра супрацьпраўных практык, шэраг з якіх з часам традыцыйна будзе фармалізаваны.

- Фармалізацыя патрабаванняў лаяльнасці ўладзе працягвае распаўсюджвацца на новыя прафесійныя групы (а таксама ўзмацняецца жорсткасць у дачыненні да групаў, якія ўжо падвергліся дзяржаўнаму кантролю). Гэтым разам дадаліся натарыюсы. Таксама ўзмоцненыя правілы атэстацыі гідаў-перакладчыкаў (для іх правілы прафесійнай этыкі змянілі раней у 2024 г.). Такім чынам, працягваецца тэндэнцыя адыходу ад фармальнай роўнасці праз змену правілаў доступу да прафесіі і прафесійнай этыкі, што цягне за сабой не толькі пераслед канкрэтных людзей, але і сістэмнае скажэнне сутнасці прафесіі.

- З'явіліся сведчанні таго, што дзяржава спрабуе заканадаўча выпраўляць катастрафічныя наступствы для сістэмнасці заканадаўства і дзяржаўнага кіравання, выкліканыя валюнтарысцкім працэсам прыняцця «пашпартнага ўказу»: з'явілася норма, якая абавязвае прадастаўляць у органы ЗАГС Беларусі звесткі аб актах грамадзянскага стану, зарэгістраваных за межамі Рэспублікі Беларусь. Відавочна, што забароны, уведзеныя ўказам, непазбежна стварылі і сістэмныя нязручнасці для самой дзяржавы. Яна не можа атрымліваць неабходную інфармацыю аб сваіх грамадзянах. Спроба гэта выправіць новымі зменамі толькі падкрэслівае хаатычнасць і дысфункцыю дзяржаўнага кіравання і заканатворчасці.

- Верагодна, дзяржава плануе трактаваць сітуацыю людзей са скончаным пашпартам, якія не маглі па меркаваннях бяспекі і па віне самой дзяржавы вярнуцца ў краіну для яго замены і не маглі абмяняць яго за мяжой з-за «пашпартнага ўказа», - як адмову чалавека ад выкарыстання пашпарта. Бо фармальна дзяржава не адмаўляе ў яго замене на сваёй тэрыторыі. Так, у заканадаўстве аб пацвярджэнні асобы для пенсійнага забеспячэння з'явілася формула «у тым ліку раней дакументаванага пашпартам грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, які адмовіўся ад яго выкарыстання».

- Працягваюць пагаршацца меры сацыяльнай абароны дзяцей, якія ствараюць глебу для рэпрэсіўных дзеянняў і індактрынацыі. Гэтым разам змены таксама з'яўляюцца часткай тэндэнцыі пераняцця расійскіх практык: заканадаўча ўводзіцца новы від дзіцячых дамоў - дзіцячыя дамы пры манастырах. Гэта ўстанова, якая ствараецца манастыром і прызначана для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў ва ўзросце ад 3 да

18 гадоў. Улічваючы ролю як Расійскай праваслаўнай царквы (РПЦ), так і Беларускай праваслаўнай царквы (БПЦ) у прапагандзе (у тым ліку і ваеннай) такая мера - дадатковы інструмент максімальнай індактрынацыі найбольш уразлівых групаў дзяцей - тых, якія знаходзяцца ў поўнай залежнасці ад дзяржавы. І таксама можа парушаць свабоду веравызнання і права дзяцей на сям'ю.

- Вялікі блок заканадаўчых зменаў тычыцца размеркавання пасля навучання і кампенсацыі сродкаў за навучанне. З аднаго боку, там замацоўваюцца нормы, якія яшчэ больш ускладняюць становішча шэрагу катэгорый выпускнікоў, якія навучаліся за бюджэтныя сродкі або за сродкі арганізацыі: узмацняюцца правілы размеркавання мужа ці жонкі, выпускнікоў асобных спецыяльнасцяў і ў прынцыпе выпускнікоў, накіраваных у сельскую мясцовасць, а таксама правілы кампенсацыі сродкаў для «мэтавікоў». З іншага боку, усталёўваюцца асаблівыя новыя гарантыі і льготы ў сферы размеркавання і кампенсацыі сродкаў за навучанне для супрацоўнікаў сілавога апарата, іх сем'яў, а таксама прызыўнікоў. Таксама зменены дзяржаўны класіфікатар спецыяльнасцяў і кваліфікацый у сферы вышэйшай адукацыі: пашыраны спіс спецыяльнасцяў, звязаных з нацыянальнай бяспекай. Такім чынам, відавочна новая спроба дзяржавы ўмацаваць патэнцыял сілавога апарата праз сістэму адукацыі і працаўладкавання.

- Узмацняецца фармалізацыя ідэалогіі, у тым ліку і мілітарысцкі кампанент выхавання ў школах. Дзяржава стымулюе людзей, якія адказваюць у школах за ваенна-патрыятычнае выхаванне, да большай актыўнасці і «вынаходлівасці». Зацверджаны рэспубліканскі конкурс «Кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні» для ўстановаў сярэдняй адукацыі. Гэта, хутчэй за ўсё, будзе матываваць людзей, якія займаюць гэтыя пасады, выслужвацца і будзе весці да павышэння бессэнсоўных мерапрыемстваў для дзяцей і павышэння канцэнтрацыі мілітарызму ў ідэалагічным выхаванні.

- Скарочаныя сацыяльныя гарантыі пенсіянерам, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі. Скасаваная норма аб абавязковым мінімуме пенсійных выплат, а таксама пашыраны пералік падставаў для ўтрымання з такіх выплат. Цяпер з пенсіянераў, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, могуць ўтрымліваць сродкі для кампенсацыі кошту харчавання, камунальных паслуг, сродкаў асабістай гігіены, адзення і абутку.

- Асноўная важная змена ў другім трыместры 2024 г. у палітыцы ўладаў - змена паводзінаў у дачыненні да палітвязняў. Пачалося іх сістэмнае і заўважнае памілаванне. У ліпені-аўгусце вызваленыя мінімум 48 чалавек. У пачатку-сярэдзіне верасня - яшчэ мінімум 67 чалавек. Такім чынам, на момант выхаду гэтага аналіза ўлады памілавалі мінімум 115 чалавек.[3]

[3] *Нягледзячы на тое, што гэты аналіз за травень-аўгуст, мы адзначаем тут таксама і вызваленні верасня, так як відавочна, гэта крокі дзяржавы ў рамках аднаго працэса, які пачаўся ў ліпені.*

- Улады выкарыстоўвалі смяротны прысуд у дачыненні да замежніка ў палітычных мэтах. Грамадзяніна Германіі Рыка Крыгера, арыштаванага ў Беларусі, абвінавацілі па шасці артыкулах Крымінальнага кодэкса, у тым ліку найміцтва і тэрарызм. Гэта першы выпадак смяротнага прысуду за дзеянні, якія не прывялі да чалавечых ахвяраў, і таксама першы смяротны прысуд замежніку за апошнія 15 гадоў (кампанія «Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання ў Беларусі» адсочвае смяротныя прысуды з 2009 г.) Праз тыдзень пасля прысуду Р.Крыгер быў памілаваны А.Лукашэнкам і стаў часткай «вялікага абмену» паміж Расеяй, ЗША, Германіяй і некаторымі іншымі краінамі: у асноўным абмену расейскіх палітвязняў і замежных грамадзянаў, абвінавачаных Расеяй ў шпіянажы, на супрацоўнікаў ФСБ і некаторых іншых асобаў . Характэрна, што нягледзячы на тое, што «справа Крыгера» была зроблена рукамі беларускіх уладаў, ніводзін беларускі палітвязень не ўвайшоў у абменны спіс.

- З'яўляюцца ўсё новыя практыкі ў прымяненні артыкулаў аб экстрэмізме. Упершыню экстрэмісцкімі прызнаныя інтэрнэт-рэсурсы, якія аказваюць дапамогу прызыўнікам. Упершыню была заведзеная крымінальная справа за рэпост навіны з рэсурсу, прызнанага экстрэмісцкім: перасылка навіны ў публічны чат была кваліфікаваная як спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці паводле арт. 361-4 КК.

- Пашыраюцца практыкі ціску на працоўных месцах у сувязі з выездам за мяжу ў «непрыязныя краіны». На дзяржаўных прадпрыемствах і ў дзяржаўных установах штатныя супрацоўнікі КДБ («намеснікі па бяспецы») выкарыстоўваюць розныя формы ціску на людзей незалежна ад пасады і віду паездкі (камандзіроўка/адпачынак). Відавочна няма адзіных інструкцый, але ёсць агульнае ўказанне кантролю. Такім чынам, павялічваецца ўсёахопнасць кантролю, а таксама тэндэнцыя руху да «жалезнай заслоны» часоў СССР, якую мы фіксуем з 2023 г. і якая, у сваю чаргу, з'яўляецца адной з праяваў палітыкі «антызаходніцтва» беларускага рэжыму.

- Узмацняецца ціск на людзей, якія з'ехалі за мяжу з-за пераследу:

  - Па-першае, узмацняецца ціск на іх сваякоў, з'яўляюцца яго новыя формы: з'явілася практыка запісу са сваякамі «пакаяльных відэа».

  - Па-другое, пашыраецца ціск праз арышт і канфіскацыю маёмасьці: павялічаная колькасьць «падазраваных» па справе супраць беларускіх дыяспараў за мяжой, якая была ўзбуджаная ў сакавіку 2024 г.. Улады дадалі яшчэ 104 чалавекі, якія ўдзельнічалі ў сьвяткаваньні Дня Волі 25 сакавіка 2024 г. за мяжой. На іхную маёмасць будзе накладзены арышт. Таксама распачатая крымінальная справа супраць усіх 257 чалавек, якія балатаваліся на выбарах у Каардынацыйную раду. Іх маёмасць таксама арыштаваная.

- Па-трэцяе, стала вядома пра выпадак анулявання судом угоды па продажы па даверанасці кватэры беларускі, на якую была заведзеная крымінальная справа за «спрыянні экстрэмісцкай дзейнасці». Кватэру брат жанчыны прадаў іх бацьку за 9 месяцаў да завядзення справы.

- Па-чацвёртае, пераслед за ахвяраванні ў фонды, якія дапамагаюць палітвязням, як неправавая практыка «водкупу» ад адказнасці і папаўнення дзяржаўнага бюджэту, таксама «перакінулася» за мяжу. Супрацоўнікі КДБ просяць у IT-кампаніях звесткі з'ехаўшых, тэлефануюць ім і прапануюць вярнуцца ў Беларусь, каб аплаціць свой «доўг».

- З новых рэакцый міжнароднай супольнасці на крызіс правоў чалавека ў Беларусі за другі трыместр 2024 г. можна адзначыць толькі паўторны запуск Венскага механізма АБСЕ. Механізм быў запушчаны па ініцыятыве 38 краін-сябраў АБСЕ ў сувязі з адсутнасцю рэакцыі беларускіх уладаў на справаздачу па выніках другога Маскоўскага механізму, прадстаўленую ў траўні 2023 г.

# I. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДУМОВЫ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ

ГАЛОЎНАЕ:

- пашыраныя ўмовы для палітычнага пераследу праз змяненне правілаў доступу да прафесіі і прафесійнай этыкі, што цягне за сабой не толькі пераслед канкрэтных людзей, але і сістэмнае скажэнне сутнасці прафесіі, і пагаршае сітуацыю сацыяльнай шызафрэніі;
- змененыя правілы размеркавання пасля навучання і кампенсацыі сродкаў за навучанне: узмоцнілася жорсткасць умоваў для некаторых катэгорый выпускнікоў і пашыраныя ільготы для сілавога апарата;
- скарочаныя сацыяльныя гарантыі пенсіянерам, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі.

## ПАШЫРЭННЕ ЛЕГАЛІЗАЦЫІ СІСТЭМНЫХ РЭПРЭСІЙ

1. Фармалізацыя патрабаванняў лаяльнасці ўладзе працягвае распаўсюджвацца на новыя прафесійныя групы (а таксама ўзмацняецца жорсткасць у дачыненні да групаў, якія ўжо падвергліся цэнзуры).[4]

**Па-першае**, заканадаўча замацаваны беспрэцэдэнтны палітычны фільтр у дачыненні да экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў. Нагадаем, што ў ліпені 2023 г. дзяржава зацвердзіла новыя прафесійныя і этычныя патрабаванні ў гэтай сферы, якія змяшчаюць шэраг дыскрымінацыйных і парушаючых правы чалавека палажэнняў. Цяпер унесеныя змены ў Палажэнне аб парадку і ўмовах праходжання прафесійнай атэстацыі, якая пацвярджае кваліфікацыю экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў. Паводле зменаў, зараз да атэстацыі:

[4] *У ліпені 2023 г. былі экскурсаводы і гіды-перакладчыкі, у сакавіку 2024 – касманаўты.*

- увогуле не дапушчаюцца людзі, прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці па «пратэстных»[5] артыкулах, незалежна ад зняцця або пагашэння судзімасці або спынення крымінальнага пераследу;
- людзі, прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці па «пратэстных»[6] артыкулах, дапускаюцца толькі праз 5 гадоў з дня ўступлення ў сілу пастановы аб накладанні адміністрацыйнага спагнання;
- людзі, пасведчанне якіх было ануляванае за грубае парушэнне[7] прафесійных і этычных патрабаванняў, устаноўленых заканадаўствам, дапускаюцца толькі праз 5 гадоў з дня рашэння аб ануляванні пасведчання.

Па-другое, Міністэрства юстыцыі зацвердзіла **новыя** Правілы **прафесійнай этыкі натарыюса**. Сярод правілаў, якія ганьбяць гонар і годнасць натарыюса, там указаныя: удзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах, удзел у любой дзейнасці, накіраванай на дыскрэдытацыю Рэспублікі Беларусь, органаў дзяржаўнай улады і кіравання (уключаючы асабісты ўдзел, пасярэдніцтва або супрацоўніцтва шляхам аказання паслуг, рэгістрацыю ў экстрэмісцкіх фармаваннях і падпіску на інфармацыйныя рэсурсы, прызнаныя экстрэмісцкімі, тыражаванне і распаўсюд іх кантэнту).

Такім чынам, працягваецца і пашыраецца тэндэнцыя адыходу ад фармальнай роўнасці і замацаванне прамых дыскрымінацыйных палажэнняў у кантэксце палітычнай лаяльнасці. Пры гэтым, гэтыя палажэнні, будучы інкарпараванымі ў правілы прафесійнай этыкі, фактычна перашкаджаюць выкананню прафесійных абавязкаў належным чынам, прымушаючы чалавека як раз адыходзіць ад рэальнай этыкі прафесіі дзеля палітычнай кан'юнктуры.

2. Працягвае эвалюцыянаваць **тэндэнцыя запалохвання дзяржслужбоўцаў і вайскоўцаў**. Уведзеная крымінальная адказнасць за незаконны выезд асобаў, правы якіх на выезд з Рэспублікі Беларусь заведама для іх часова абмежаванае, і дасведчаных аб дзяржаўнай таямніцы. Артыкул 375-2 «Парушэнне патрабаванняў па абароне дзяржаўных сакрэтаў», у які ўнесеныя гэтыя змены, быў часткай рэпрэсіўных навелаў крымінальнага заканадаўства, якія з'явіліся ў пачатку 2023 г.[8] Аднак першапачатковa адказнасці падлягала толькі перамяшчэнне за межы Беларусі матэрыяльнага носьбіта дзяржаўных сакрэтаў з інфармацыяй.

---

[5] 123, 130–130-1, 293, 341-1, 342, 357, 361, 367–369-1, 369-3 і 370 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь.

[6] 19.8, 19.10, 19.11, 24.22 и 24.23 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях.

[7] Да грубых парушэнняў, паводле зменаў, адносяцца, у тым ліку: «праява непавагі да дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь, гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці; адмова фармаваць уяўленне аб Рэспубліцы Беларусь як аб краіне, прывабнай для турыстаў, допушчэнне пры правядзенні экскурсій суб'ектыўных некарэктных ацэнак і выказванняў аб Рэспубліцы Беларусь і іншых дзяржавах; непрыняцце мер па недапушчэнні з боку турыстаў, экскурсантаў ці іншых асоб некарэктных, правакацыйных і іншых негатыўных выказванняў ці дзеянняў».

[8] Тады было ўведзена смяротнае пакаранне за дзяржаўную здраду для некаторых катэгорыяў дзяржаўных служачых і вайсковых.

## СПРОБЫ ВЫПРАВІЦЬ НАСТУПСТВЫ РЭПРЭСІЎНАЙ НОРМАТВОРЧАСЦІ («ПАШПАРТНАГА ЎКАЗУ») ДЛЯ САМОЙ СІСТЭМЫ

1. У пачатку ліпеня 2024 г. падпісаны Закон «Аб змене законаў па пытаннях рэгулявання шлюбных і сямейных адносін». Нароўні з іншымі зменамі, ён уводзіць новую норму ў Кодэкс аб шлюбе і сям'і - **абавязак грамадзянаў прадастаўляць звесткі аб актах грамадзянскага стану (далей - АГС), зарэгістраваных за межамі Рэспублікі Беларусь** – у органы ЗАГС Беларусі. Тэрмін, на працягу якога гэта павінна быць зроблена - 6 месяцаў з даты рэгістрацыі. Пры гэтым норма распаўсюджваецца на ўсе АГС, зарэгістраваныя за мяжой грамадзянамі Беларусі (незалежна ад пастаяннага пражывання або часовага знаходжання).

Да АГС, паводле Кодэксу, належаць: нараджэнне, заключэнне шлюбу, усынаўленне/удачарэнне, усталяванне мацярынства і (або) бацькоўства, змена прозвішча, імя, імя па бацьку, смерць, а таксама скасаванне шлюбу.

З аднаго боку, можна з дастатковай верагоднасцю сказаць, што рэжым такім чынам спрабуе заканадаўча выпраўляць катастрафічныя наступствы для сістэмнасці заканадаўства і дзяржаўнага кіравання, выкліканыя валюнтарысцкім працэсам прыняцця «пашпартнага ўказу» (гл. падрабязней тут). Забарона выдачы даведак аб актах грамадзянскага стану, паўторнага пасведчання аб актах грамадзянскага стану, як і перашкода атрыманню дзейнага пашпарта ў дыпламатычных і консульскіх установах - непазбежна стварае і сістэмныя нязручнасці для самой дзяржавы. Яна не можа атрымліваць неабходную інфармацыю аб сваіх грамадзянах.

У сувязі з гэтым важна адзначыць, што змянілася і норма аб рэгістрацыі АГС - удакладненая мэта такой рэгістрацыі: апрача абароны асабістых немаёмасных і маёмасных правоў грамадзян, а таксама дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў, дадалося «у тым ліку для збору поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб грамадзянскім стане».

Пры гэтым, з іншага боку, у адрозненне ад абавязку паведаміць пра наяўнасць замежнага віду на жыхарства,[9] абавязак паведамляць аб рэгістрацыі АГС за мяжой нельга адназначна назваць неправамерным, бо дзяржава мае права ўсталёўваць пералік АГС, абавязковы для рэгістрацыі і весці іх улік. Менавіта гэтую функцыю выконваюць прадстаўніцтвы дзяржавы за мяжой (што і было ўказана ў Кодэксе да змен). Аднак, у гэтым выпадку, улічваючы нядобрасумленныя паводзіны

[9] *Змены, унесеныя ў Закон «Аб грамадзянстве» ў пачатку студзеня 2023 г., якія набылі моц з 1 ліпеня 2023 г., мы аналізавалі тут (с. 15).*

самой дзяржавы і наўмыснае супрацьдзеянне рэгулярнаму парадку здзяйснення такіх дзеянняў грамадзянамі, якія знаходзяцца за мяжой, такое новаўвядзенне выглядае вельмі цынічным, але ў першую чаргу - хаатычным і падкрэслівае **дысфункцыю дзяржаўнага кіравання і заканатворчасці**.

2. У ліпені ўнесеныя змены ў Палажэнне аб парадку пацвярджэння асобы грамадзянаў Рэспублікі Беларусь, якія не маюць дакумента, які засведчвае асобу, для мэтаў пенсійнага забеспячэння. Удакладнены пералік асобаў, якія могуць звяртацца ў мясцовыя органы ўлады для пацверджання асобы, каб атрымаць пенсію: да фразы «грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія не маюць дакумента, які сведчыць асобу» дададзеная «у тым ліку раней дакументаванага пашпартам грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, які адмовіўся ад яго выкарыстання».

Можна меркаваць, што такой формулай – **«раней дакументаваны пашпартам грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, які адмовіўся ад яго выкарыстання»** - дзяржава плануе абазначаць людзей, якія не маглі па меркаваннях бяспекі і па віне самой дзяржавы вярнуцца ў краіну для замены пашпарта і абмяняць яго за мяжой. Здаецца, дзяржава мае намер трактаваць гэта як адмову чалавека ад выкарыстання пашпарта, бо фармальна яна не адмаўляе ў яе замене на сваёй тэрыторыі.

## ЗМЕНА МЕРАЎ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ДЗЯЦЕЙ, ШТО СТВАРАЮЦЬ ГЛЕБУ ДЛЯ РЭПРЭСІЎНЫХ ДЗЕЯННЯЎ І ІНДАКТРЫНАЦЫІ

Напачатку ліпеня 2024 г. набылі моц змены у Пастанову Міністэрства адукацыі 2011 г. № 124 «Аб дзіцячым доме, дзіцячай вёсцы, дзіцячым гарадку». Паводле іх, **уводзіцца новая форма дзіцячых дамоў – дзіцячыя дамы пры манастыры**. Згодна з дакументам, гэта ўстанова, якая ствараецца манастыром і прызначана для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў. Таксама там пазначана, што такія ўстановы ажыццяўляюць постінтэрнатнае суправаджэнне выпускнікоў. Установы могуць быць як дзяржаўнымі, так і прыватнымі. Гэта рэалізацыя ідэі, якую Н. Качанава яшчэ ў траўні 2023 г. абмеркавала з прадстаўнікамі БПЦ, адзначыўшы, што гэта расейская практыка, якую яна лічыць патрэбным пераняць.

Улічваючы ролю РПЦ (часткай якой з'яўляецца БПЦ) у расейскай дзяржаўнай ідэалогіі, ідэалогіі «рускага свету» і прапагандзе (у тым ліку ваеннай), такія дзіцячыя дамы відавочна стануць інструментамі максімальнай

індактрынацыі найбольш уразлівых групаў дзяцей - дзяцей, якія знаходзяцца ў поўнай залежнасці ад дзяржавы.

У дакуменце ўказана, што пры накіраванні дзяцей у такія дзіцячыя дамы «пры наяўнасці звестак», улічваецца іх стаўленне да рэлігіі, рэлігійныя традыцыі сем'яў, у якіх выхоўваліся дзеці. Разам з тым, наўрад ці можна ўявіць рэальны ўлік гэтага, у тым ліку зыходзячы з размытага «пры наяўнасці звестак», і таксама відавочнай праўладнай пазіцыі БПЦ. Можна прагназаваць, што рэалізацыя такой меры будзе прыводзіць да парушэння, прынамсі, свабоды веравызнання. Выкарыстанне менавіта манастыроў – дыскрымінацыйная мера ў адносінах да іншых форм арганізацыі рэлігійнага жыцця. Таксама будзе парушацца свабода думкі дзяцей і іх права на сямейнае жыццё, таму што стандартам сёння з'яўляецца прыярытэт сямейнага ўладкавання дзяцей-сірот.

Гэтыя меры таксама важна суадносіць з узмацненнем тэндэнцыі змены мераў сацыяльнай абароны, якія ствараюць глебу для рэпрэсіўных дзеянняў, якую мы фіксавалі ў другой палове 2023 г. Сярод іх - змена пераліку паказчыкаў сацыяльна-небяспечнага становішча (СНС) і, адпаведна, змена падставаў для пастаноўкі сям'і ў СНС.

## УЗМАЦНЕННЕ ПАТЭНЦЫЯЛУ СІЛАВОГА АПАРАТУ ПРАЗ СІСТЭМУ АДУКАЦЫІ І ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

1. У справаздачны перыяд у Парламент унесены комплексны законапраект «Аб змене законаў па пытаннях адукацыі». **Вялікі блок зменаў тычыцца размеркавання і кампенсацыі сродкаў за навучанне**. З аднаго боку, там замацоўваюцца нормы, якія ўскладняюць становішча катэгорый выпускнікоў, якія навучаліся за бюджэтныя сродкі ці за сродкі арганізацыі (гл. ніжэй у гэтым раздзеле). З іншага - усталёўваюцца асаблівыя новыя гарантыі і льготы для супрацоўнікаў сілавога апарата, іх сем'яў, а таксама прызыўнікоў.

**Па-першае**, з'явіліся **новыя льготныя ўмовы размеркавання супрацоўнікаў сілавых ведамстваў**. Унесеныя змены ў нормы аб абавязковым размеркаванні асоб, якія навучаліся вочна не менш за палову тэрміну за кошт дзяржаўнага бюджэту. Цяпер у такім выпадку ад размеркавання вызваляюцца тыя, хто на момант размеркавання з'яўляецца супрацоўнікамі Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, ваенізаваных арганізацый, органаў дзяржаўнай бяспекі, мытных органаў, пракурорскімі работнікамі.

**Па-другое**, раней маладыя спецыялісты, якія не адпрацавалі поўны тэрмін па размеркаванні, вызваляліся ад кампенсацыі сродкаў у дзяржаўны бюджэт у выпадку, калі ім немагчыма прадаставіць новае месца працы ў населеным пункце, дзе працуе, праходзіць ваенную службу муж (жонка), і калі муж (жонка) пражывае ў Беларусі ўвесь час або накіраваны на працу ў дыпламатычнае прадстаўніцтва. Цяпер жа **ад кампенсацыі можна будзе вызваліцца толькі ў выпадку, калі муж (жонка)**:

- абраны на выбарную пасаду службоўца ў дзяржаўныя органы,
- з ліку вайсковаслужбоўцаў (акрамя тых, якія праходзяць тэрміновую вайсковую службу, службу ў рэзерве, альтэрнатыўную службу, курсантаў),
- з ліку асобаў начальніцкага і радавога складу ваенізаваных арганізацый, супрацоўнікаў Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, органаў дзяржаўнай бяспекі, мытных органаў, пракурорскіх работнікаў.

**Па-трэцяе**, узмацніліся працоўныя гарантыі асобам у сувязі з праходжаннем ваеннай службы, накіраваннем на альтэрнатыўную службу. Раней ільготы ўсталёўваліся ў сувязі і на перыяд пасля звальнення з вайсковай службы. Цяпер у адпаведнасці з унесенымі дапаўненнямі ў Працоўны кодэкс, наймальнік абавязаны на працягу 5 дзён з дня атрымання паведамлення ваеннага камісарыята, **узяць назад чалавека, «звольненага ў сувязі з заклікам на ваенную службу, але не накіраванага для праходжання ваеннай службы»**.

2. У ліпені 2024 зменены дзяржаўны класіфікатар спецыяльнасцяў і кваліфікацый у сферы вышэйшай адукацыі – **пашыраны кампанент спецыяльнасцяў, звязаных з нацыянальнай бяспекай**. Уведзеныя такія новыя спецыяльнасці як «Фінансавы аналіз у забеспячэнні нацыянальнай бяспекі» (кваліфікацыя - спецыяліст у сферы забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Фінансавы аналітык), «Ідэалагічная работа і кадравая палітыка ў органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях». Таксама зменена атрыманая кваліфікацыя па спецыяльнасці «Псіхалогія ў забеспячэнні нацыянальнай бяспекі». Раней яна пазначалася проста «Псіхолаг», цяпер дадалося «Спецыяліст у сферы гарантавання нацыянальнай бяспекі. Псіхолаг». Таксама ўнесеныя змены ў кваліфікацыю, назва якой у класіфікатары зашыфраваная як «закрытая кваліфікацыя» па закрытай спецыяльнасці.

# УЗМАЦНЕННЕ КАНТРОЛЮ І ІДЭАЛАГІЗАЦЫЯ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ

1. Летам 2024 г. ў Беларусі **спынілі працу (фактычна былі закрытыя пад прымусам дзяржавы) дзве найстарэйшыя прыватныя ВНУ**: Беларускі інстытут правазнаўства (працаваў з 1990 г.) і Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці (працаваў з 1992 г). Яшчэ ў адной прыватнай ВНУ - Інстытуце парламентарызму і прадпрымальніцтва паведамілі, што не закрываюцца, але набіраць першакурснікаў у новым навучальным годзе не будуць, бо Міністэрства адукацыі не ўзгадніла набор. Пры гэтым, у чэрвені 2024 г. прадстаўнік гарадскіх уладаў, які адказвае за адукацыю, пацвердзіў, што ў Мінску **не засталося ніводнага прыватнага дзіцячага саду**.

Прэтэнзіі дзяржавы да прыватных установаў адукацыі - адзін з водгукаў падзеяў 2020 г. і іх «зачыстка» на ўсіх узроўнях - частка агульнай рэпрэсіўнай палітыкі па барацьбе з іншадумствам.[10] Бо прыватныя ўстановы, у адрозненне ад дзяржаўных, складана кантраляваць па частцы выканання ідэалагічных патрабаванняў. У выніку бацькоў наўмысна пазбавілі выбару месца для навучання свайго дзіцяці (прыватныя школы і дзіцячыя сады часта разглядаліся бацькамі як альтэрнатыва дзяржаўным у сувязі з меншым аб'ёмам ідэалогіі), што парушае права на адукацыю ў частцы свабоды выбару. Таксама такія дзеянні парушаюць канстытуцыйную гарантыю роўнай абароны і роўных умоваў для развіцця ўсіх форм уласнасці.

Апрача гэтага, важна адзначыць, што пасля 2020 г. прыватныя ВНУ сталі вырашэннем пытання з працаўладкаваннем для выкладчыкаў, звольненых па палітычных матывах з дзяржаўных ВНУ. Такім чынам, для некаторых людзей закрыццё гэтых ВНУ будзе азначаць другую страту працы: многія з іх не могуць уладкавацца ў дзяржаўныя ВНУ, бо знаходзяцца ў «чорных спісах» як палітычна нядобранадзейныя.

2. Адбываецца **ўзмацненне фармалізацыі ідэалогіі, у тым ліку і мілітарысцкага кампанента выхавання ў школах**.

**Па-першае,** у чэрвені стала вядома, што Міністэрства адукацыі разаслала ў школы ліст з **рэкамендацыямі пра тое, як прышчапляць моладзі павагу да дзяржаўных сімвалаў.** У прыватнасці, прапануецца пры прыёме ў піянерскую арганізацыю або БРСМ «праводзіць цырымонію ўшанавання дзяржаўных сімвалаў з прынясеннем клятвы на вернасць ім».

---

[10] *Восенню 2022 быў прыняты закон аб ліцэнзаванні прыватных школ і дзяцячых садкоў з рыторыкай А. Лукашэнкі аб тым, что «выявілася, што іх кіраўніцтва па дух не ўспрымае беларускую дзяржаву», хаця афіцыйнай нагодай стаў інцыдэнт са стрэлянінай з удзелам вучняў адной з прыватных школ Мінска.*

**Па-другое**, у чэрвені **зацверджаны рэспубліканскі конкурс «Кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні»** для ўстановаў сярэдняй адукацыі. Аднымі з задачаў конкурсу з'яўляюцца павышэнне прэстыжу гэтай пасады і выяўленне «перадавога вопыту працы» ў сферы ваенна-патрыятычнага выхавання. Адной з формаў такой працы, якую павінен дэманстраваць ваенрук на конкурсе – фармаванне ў школьнікаў «імкнення да службы ў вайсковых фармаваннях і ваенізаваных арганізацыях».[11]

Увядзенне такога конкурсу будзе, у тым ліку, стымуляваць людзей, якія займаюць гэтыя пасады, выслужыцца, а значыць іх дзейнасць стане яшчэ больш актыўнай і «вынаходлівай». Што, у сваю чаргу, будзе весці да павелічэння бессэнсоўных мерапрыемстваў для дзяцей і павышэння канцэнтрацыі мілітарысцкага кампанента ў ідэалагічным выхаванні.

## УЗМАЦНЕННЕ МІЛІТАРЫЗАЦЫІ

1. У ліпені стала вядома, што Міністэрства абароны выпрацавала **новую метадалогію ацэнкі ваеннай бяспекі**. Яе тэксту няма ў публічным доступе. Паводле слоў дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі А. Вольфавіча сярод новых крытэрыяў ацэнкі рызыкі ў сферы палітычнай бяспекі працэнтныя суадносіны па такіх крытэрыях, як давер насельніцтва да кіраўніка дзяржавы, давер да органаў улады і іншых інстытутаў дзяржаўнага кіравання. Зыходзячы з новай Ваеннай дактрыны, якую мы аналізавалі у мінулым трыместры, і якая зафіксавала ў якасці ваенных пагрозаў шэраг формаў выказвання нязгоды з уладай, можна прагназаваць, што пабудаваная на яе аснове метадалогія будзе спрыяць яшчэ большаму адвольнаму тлумачэнню дзеянняў нязгодных як ваенных пагроз і рызык, а такім чынам, і адвольнай ацэнцы ваеннай бяспекі.

2. Прынятае рашэнне об **павелічэнні расходаў дзяржаўнага бюджэту для дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Добраахвотнае таварыства спрыяння арміі, авіяцыі і флоту Рэспублікі Беларусь»** на забеспячэнне мабілізацыйнай падрыхтоўкі і мабілізацыі, на 3 млн. 850 тыс. рублёў для набыцця авіяцыйнай тэхнікі.

---

[11] *Нагадаем, што гэтая пасада - рудымент савецкай сістэмы, якая была скасаваная пасля развалу СССР, аднак вернутая ў беларускую сістэму адукацыі пасля пачатку поўнамаштабнага ўварвання ва Украіну ў лютым 2022 г.. З 2023 г. года школы Беларусі пачалі ўзмоцнена шукаць людзей для запаўнення гэтых вакансій.*

# ВЫРАШЭННЕ ПЫТАННЯЎ НЕДАХОПУ ГРАШОВЫХ РЭСУРСАЎ І АДТОКУ ЧАЛАВЕЧАГА КАПІТАЛУ ПРАЗ ПАРУШЭННЕ ЭКАНАМІЧНЫХ І САЦЫЯЛЬНЫХ ПРАВОЎ

Традыцыйна вырашаючы пытанні прымусовага прыцягнення сродкаў і людзей праз сістэму вышэйшай адукацыі, цяпер дзяржава вырашыла ўзмацніць жорсткасць становішча выпускнікоў і маладых спецыялістаў. У Парламент унесены законапраект «Аб змене законаў па пытаннях адукацыі». Вялікі блок змен датычыцца размеркавання і кампенсацыі сродкаў за навучанне.

### Узмацненне жорсткасці правіл размеркавання і пераразмеркавання

- Узмацніліся жорсткасць правілаў размеркавання сужэнцаў. З нормы знікла фармулёўка «па жаданні выпускніка» і з'явіўся абавязак узгадняць размеркаванне па месцы жыхарства або працы жонкі (мужа) з арганізацыяй, куды першапачаткова павінен быў быць размеркаваны чалавек.

- Узмацніліся жорсткасць правіл пераразмеркавання для выпускнікоў асобных спецыяльнасцяў і выпускнікоў, накіраваных у сельскую мясцовасць. Раней пераразмеркаванне медыкаў і выпускнікоў спецыяльнасці «Сельская гаспадарка» павінны былі ўзгадняцца з Міністэрствам аховы здароўя і аблвыканкамам (Мінгарвыканкамам) па месцы размеркавання адпаведна. Змены дадалі ў гэты пералік спецыяльнасцяў з асаблівым парадкам пераразмеркавання «Ветэрынарыю» і «Рыбную гаспадарку». Апрача таго, для маладых спецыялістаў, якім месца працы прадастаўлена шляхам размеркавання ў сельскія населеныя пункты, пераразмеркаванне ў іншае месца цяпер павінна узгадняцца з адпаведным аблвыканкамам.

- Пры гэтым, нягледзячы на прадастаўленне льгот для служачых ваеннізаваных і праваахоўных органаў (гл. вышэй у гэтым раздзеле), сталі больш жорсткімі правілы размеркавання традыцыйных «ільготнікаў», г.зн. дзяцей вайскоўцаў, міліцыянтаў, супрацоўнікаў КДБ, афіцэраў іншых сілавых структур, ветэранаў вайны ў Афганістане, якія сталі інвалідамі або загінулі ў сувязі са службай. Цяпер іх можна размеркаваць у іншае месца працы без згоды (раней было толькі са згоды выпускніка), а па жаданні - толькі па месцы жыхарства бацькоў (раней было яшчэ і па месцы жыхарства мужа і жонкі).

### Узмацненне жорсткасці правіл кампенсацыі сродкаў за «бясплатнае» навучанне

- З'явілася новае правіла кампенсацыі сродкаў для «мэтавікоў». У выпадку, калі дагавор аб мэтавай падрыхтоўцы скасаваны падчас навучання па ініцыятыве заказчыка (у сувязі з яго ліквідацыяй або ў сувязі з перашкодамі для працаўладкавання) выпускнік-мэтавік мае права «пры наяўнасці магчымасц»і перавесціся на бюджэт, але ў выпадку адмовы - павінен пакрыць кошт навучання. Раней такі чалавек проста вызваляўся ад кампенсацыі сродкаў.

- Узмацніліся жорсткасць правілаў кампенсацыі сродкаў за навучанне цяжарнымі выпускніцамі, якія не адпрацавалі поўнага тэрміну размеркавання. Калі раней можна было не пакрываць сродкаў пры немагчымасці пераразмеркавання толькі па месцы жыхарства жанчыны, то цяпер сюды дадаліся месцы жыхарства бацькоў і мужа. Гэта значыць, ускладніліся ўмовы непакрыцця, бо пашырылася колькасць выключэнняў з права цяжарнай не пакрываць сродкі.

Новыя змены яшчэ больш узмацняюць залежнасць ад дзяржавы людзей, якія атрымліваюць адукацыю за кошт дзяржаўнага бюджэту, фактычна ставячы іх у нявольніцкае становішча.

2. Унесеныя змены ў Закон аб пенсійным забеспячэнні, паводле якіх **зніжаныя сацыяльныя гарантыі пенсіянерам, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі**.

**Па-першае**, **змененыя правілы выплаты пенсій такім пенсіянерам**. Раней у норме (арт. 88 Закона) былі прапісаныя памер пенсіі і мінімумы выплат для розных катэгорый пенсіянераў («але не менш...»), якіх абавязаная была прытрымлівацца дзяржава. Цяпер жа гэтыя гарантыі мінімальных выплат скасаваныя.

**Па-другое**, **пашыраны пералік падставаў для ўтрыманняў з пенсіі.** Да наяўных дзвюх падставаў (у парадку выканаўчага справаводства і ў выпадку пераплочаных пенсій з прычыны злоўжывання з боку пенсіянера), дадаецца трэцяе: цяпер з пенсіянераў, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, могуць утрымліваць сродкі для кампенсацыі кошту харчавання, камунальных паслуг, сродкаў асабістай гігіены, адзення і абутку.

3. У канцы ліпеня А. Лукашэнка падпісаў Распараджэнне «Аб скасаванні наступстваў небяспечных метэаралагічных з'яваў», у якім абавязаў мясцовыя ўлады прыцягваць грамадзян для прыборкі тэрыторый ад наступстваў такіх з'яваў.

Гэтае распараджэнне падпісанае ў сувязі з ураганам, які прывёў да маштабных пашкоджанняў у сістэме электраперадачы, парушэнняў водазабеспячэння, разбурэнняў. У Гомельскай вобласці нават уводзілі рэжым надзвычайнай сітуацыі. Загінула сем чалавек. Людзі агучылі прэтэнзіі да ўладаў, бо ўлады не паказалі належнай рэакцыі і зладжанай працы пры ліквідацыі наступстваў, што адзначалі і самі чыноўнікі. А. Лукашэнка абвінаваціў людзей у тым, што яны не гатовыя самі «нешта зрабіць для таго, каб пераадолець катастрофу». У выніку, такая гатовасць была забяспечаная нарматыўным чынам. Што таксама з'яўляецца чарговым сведчаннем выкарыстання людзей для рашэння задач, якія абавязаная выконваць дзяржава.

# II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА: ПАРУШЭННІ ГРАМАДЗЯНСКІХ, ПАЛІТЫЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВОЎ

ГАЛОЎНАЕ:

- улады пачалі выпускаць палітвязняў: на момант выхада агляду вызваленыя мінімум 115 чалавек;
- пашыраецца ціск на працоўных месцах у сувязі з выездам у «непрыязныя краіны»;
- узмацняецца ціск на беларусаў, якія вымушана з'ехалі, праз арышт і канфіскацыю маёмасці.

## ЗМЕНЫ ПАВОДЗІНАЎ РЭЖЫМУ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ПАЛІТВЯЗНЯЎ

Асноўная важная змена ў правапрымяняльнай практыцы за май-жнівень 2024 г. – змена паводзінаў у дачыненні да палітычных вязняў: пачалося іх **сістэмнае і прыкметнае памілаванне**.

У ліпені-пачатку верасня 2024 г. **улады вызвалілі мінімум 78 чалавек**: 3 ліпеня 2024 г. стала вядома аб вызваленні 18 палітвязняў. Напярэдадні быў падпісаны Закон аб амністыі, які, аднак, выключаў артыкулы, па якіх асуджаныя палітвязні. Разам з тым, А. Лукашэнка напярэдадні заявіў, што збіраецца выпусціць на волю некаторых цяжкахворых палітвязняў. Тым не менш з вызваленых 18-ці чалавек цяжкахворым быў толькі Рыгор Кастусёў. Паводле інфармацыі ПЦ Вясна, гэтыя людзі былі вызваленыя па памілаванні і амністыі.

16 жніўня стала вядома аб памілаванні яшчэ 30 чалавек, 4 верасня стала вядома аб памілаванні яшчэ 30, а 16 верасня быў падпісаны яшчэ адзін указ аб памілаванні 37 чалавек. Такім чынам, на момант выхаду гэтага аналіза ўлады памілавалі мінімум 115 чалавек.[12] Пры гэтым, важна адзначыць непразрыстасць

[12] *Нягледзячы на тое, што гэты аналіз за травень-аўгуст, мы адзначаем тут таксама і вызваленні верасня, так як відавочна, што гэта крокі дзяржавы ў рамках аднаго працэса, які пачаўся ў ліпені.*

працэсу: не раскрываюцца акты аб памілаванні, праваабаронцы даведваюцца пра імёны памілаваных або з паведамленняў сваякоў, сяброў, іншых вязьняў, што выйшлі на волю або ад прапагандыстаў (з некаторымі з вызваленых запісваюць інтэрв'ю для дзяржаўнага тэлебачання).

Складана рабіць адназначныя высновы аб канкрэтных прычынах і матывах змены паводзінаў улады, аднак факт такой змены адназначна можна канстатаваць. Пры гэтым, праўладны актывіст і прапагандыст Ю. Васкрасенскі ў эфіры дзяржаўнага тэлебачання заяўвіў, што палітвязні напісалі ўжо 900 прашэнняў аб памілаванні.

## МАСАВАЯ ЗАМЕНА ПАКАРАННЯ Ў ВЫГЛЯДЗЕ АБМЕЖАВАННЯ СВАБОДЫ БЕЗ НАКІРАВАННЯ Ў КАЛОНІЮ НА БОЛЬШ ЖОРСТКАЕ

Паводле інфармацыі ПЦ Вясна, пачынаючы з ліпеня зафіксавана мінімум 15 фактаў **узмацнення жорсткасці пакарання**: людзям, асуджаным па «палітычных» артыкулах і адбываючых пакаранне ў выглядзе «хатняй хіміі» (абмежаванне свабоды без накіравання ў месцы зняволення) замяняюць яго на калонію. Сама практыка такой замены не новая, аднак цяпер канстатуецца яе даволі масавы характар.

## ВЫКАРЫСТАННЕ СМЯРОТНАГА ПРЫСУДУ Ў ПАЛІТЫЧНЫХ МЭТАХ

24 чэрвеня быў вынесены смяротны прысуд у дачыненні да Рыка Крыгера - грамадзяніна Германіі. Яго звінавацілі ў наёмніцтве, здзяйсненні тэрарыстычнага акту і іншых злачынстваў «экстрэмісцкага характару». Гэта **першы** ў Беларусі **прысуд** да выключнай меры пакарання **за дзеянні, якія не пацягнулі чалавечых ахвяр. І таксама першы смяротны прысуд замежніку** з часу існавання кампаніі «Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання ў Беларусі» (з 2009 г.). 30 ліпеня Р.Крыгер напісаў прашэнне аб памілаванні на імя А. Лукашэнкі і ў той жа дзень быў памілаваны.

**Па-першае**, праваабаронцы адзначаюць, што шэраг інкрымінаваных яму дзеянняў фактычна не былі здзейсненыя. Кваліфікацыя дзеянняў як тэрарыстычнага акту была адвольнай, закліканай даць падставу для адвольнага асуджэння да пакарання смерцю пры адсутнасці чалавечых ахвяр — гэта, у сваю чаргу, стала

магчымым пасля ўнясення адпаведных зменаў у Крымінальны кодэкс у 2022 г., якія пашырылі магчымасці прымянення пакарання смерцю. Ёсць шматлікія прыкметы таго, што Крыгер стаў ахвярай правакацыі беларускіх спецслужбаў.

**Па-другое**, 1 жніўня адбыўся вялікі абмен зняволенымі паміж Расіяй і ЗША, Германіяй пры ўдзеле яшчэ 4 краін. Крыгер быў сярод тых, каго абмянялі. Аналітыкі адзначаюць, што **смяротны прысуд Крыгеру стаў дадатковым фактарам прымусу Нямеччыны да ўгоды**, бо Расея хацела атрымаць ад яе супрацоўніка ФСБ В. Красікава, прысуджанага ў Нямеччыне да пажыццёвага зняволення.

У выніку абмену з боку Расіі на волі аказаліся 16 чалавек, з якіх як мінімум 8 - атрымалі тэрміны па палітычных матывах як апаненты ўлады і прадстаўнікі апазіцыі. **Беларускія палітвязні не патрапілі ў гэты абмен, нягледзячы на тое, што «справа Крыгера» была зроблена рукамі беларускіх уладаў**.

## НОВЫЯ ПРАКТЫКІ ПЕРАСЛЕДУ ПА АРТЫКУЛАХ АБ ЭКСТРЭМІЗМЕ

У другім трыместры 2024 г. развіваліся практыкі палітычнага пераследу па «экстрэмісцкіх артыкулах».

**Па-першае**, упершыню прызнаныя экстрэмісцкімі і заблакаваныя інтэрнэт-рэсурсы, **праз якія аказвалася дапамога прызыўнікам**. Генеральная пракуратура адзначае, што такім чынам выяўлены «негатыўныя фактары, якія здольныя аказаць уплыў на ўкамплектаванасць злучэнняў і воінскіх часцей, а таксама стварыць пагрозу нацыянальнай бяспецы».

**Па-другое**, паводле інфармацыі тэлеграм-канала, афіляванага з ГУБАЗіК, упершыню была ўзбуджаная **крымінальная справа за рэпост навіны з рэсурсу, прызнанага экстрэмісцкім.** Паводле агульнага правіла, за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў павінна наступаць адміністрацыйная адказнасць. Аднак у гэтым выпадку перасыланне навіны ў публічны чат было кваліфікавана як спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці па арт. 361-4 КК.

**Па-трэцяе**, упершыню атрыманае афіцыйнае пацвярджэнне (указанне ў рашэнні суда), што **выданні, прызнаныя экстрэмісцкімі, улады фізічна знішчаюць**. Пры гэтым важна падкрэсліць, што ў асноўным экстрэмісцкімі прызнаюцца кнігі на беларускай мове і/ці на нацыянальную тэматыку. Такім чынам, гэта таксама зрэз барацьбы цяперашняй улады з нацыянальнай культурай - знішчэнне беларускіх кніг.

**Па-чацвёртае**, у канцы красавіка (мы не ўказалі гэтага ў папярэднім выпуску) зафіксаваная **першая і пакуль адзіная адмена рашэння аб прызнанні выдання экстрэмісцкім**. Зборнікі з творамі беларускага класіка Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, з-за якіх іх прызналі экстрэмісцкімі, выключылі з Рэспубліканскага спіса экстрэмісцкіх матэрыялаў. Яны былі ўключаныя ў яго ў лістападзе 2023 г.

## ПАШЫРЭННЕ ЦІСКУ НА РАБОЧЫХ МЕСЦАХ

1. Працягвае эвалюцыянаваць **палітычна матываваны ціск на працаўнікоў дзяржаўнага сектара ў сувязі з іх выездам за мяжу ў «непрыязныя краіны»**. У першым трыместры 2024 г. у якасці такой практыкі і ініцыятывы мясцовых супрацоўнікаў КДБ мы адзначалі анкету, якую цяпер павінны запаўняць па прыездзе ўсе супрацоўнікі БДУ, якія выязджаюць (нават падчас адпачынку) у любую краіну, акрамя Расіі. У другім трыместры стала зразумела, што гэта агульная практыка.

Стала вядома, што ў розных бюджэтных сектарах, штатныя супрацоўнікі КДБ праводзяць гутаркі і агітацыю наконт таго, што не варта ехаць у «непрыязныя краіны» (у першую чаргу Польшчу, Літву, Латвію). Некаторыя пагражаюць звальненнем, калі стане вядома пра тое, што нехта ездзіць у гэтыя краіны без прычыны. Іншыя кажуць, што ніякага пакарання за гэта не будзе, але можа быць прынята да ўвагі пры кар'ерным прасоўванні чалавека. Яшчэ адна практыка з абласнога горада - штатны супрацоўнік КДБ выдаў загад, з якім работнікаў азнаёмілі пад роспіс і абавязалі па вяртанні пісаць дакладную запіску на імя дырэктара з апісаннем маршруту і сустрэч у паездцы. Яшчэ на адным буйным дзяржаўным прадпрыемстве распавялі, што ўсе работнікі незалежна ад пасады павінны цяпер узгадняць з начальствам паездкі (у тым ліку ў адпачынак) у «непрыязныя краіны».

Зыходзячы з разнастайнасці практык ціску, відавочна, што няма адзінай цэнтралізаванай інструкцыі, але дадзенае агульнае ўказанне кантролю за такімі выездамі. Таксама відавочна, што гэтая практыка пашыраецца і будзе набываць новыя формы.

2. У чэрвені таксама стала вядома, што супрацоўнікаў прыватных кампаній прымушаюць падпісваць дакументы, у якіх яны абавязваюцца «не прадпрымаць дзеянняў, якія парушаюць заканадаўства Рэспублікі Беларусь, не дапускаць дэструктыўных праяваў па месцы працы і жыхарства, не ўдзельнічаць у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах і іншых акцыях пратэсту, не

ўступаць у экстрэмісцкія і іншыя дэструктыўныя арганізацыі, супольнасці і групы (чаты), не аказваць ім спрыяння ў іх дзейнасці».

Такія практыкі з'яўляюцца парушэннем права на спрыяльныя і годныя ўмовы працы, свабоду выказвання думак, з'яўляюцца палітычна матываванай дыскрымінацыяй.

## УЗМАЦНЕННЕ ЦІСКУ НА СВАЯКОЎ ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ ВЫМУШАНЫЯ З'ЕХАЦЬ ЗА МЯЖУ

У першым трыместры 2024 г. мы фіксавалі трэнд узмацнення ціску на сваякоў нязгодных - палітвязняў ці ў цэлым людзей, вымушаных з'ехаць за мяжу. У другім трыместры відавочныя новыя праявы такога ціску і пераследу сваякоў. У ліпені сілавікі прыйшлі да сваякоў вядучых TikTok-акаўнтаў «Люстэрка». Пры гэтым, з імі не проста правялі гутарку, але запісалі **«пакаяльныя відэа»**.

## НОВЫЯ ПРАКТЫКІ І ЎЗМАЦНЕННЕ ПЕРАСЛЕДУ ЛЮДЗЕЙ, ЯКІЯ ВЫМУШАНЫЯ З'ЕХАЦЬ ЗА МЯЖУ

Улады працягваюць шукаць новыя формы ціску на людзей, якія з'ехалі за мяжу і не маюць магчымасці вярнуцца ў сілу палітычнага пераследу. **Адной з формаў, якія актыўна развіваюцца, становіцца арышт і канфіскацыя маёмасці**.

1. У маі 2024 Следчы камітэт пашырыў колькасць «падазраваных» па справе супраць беларускіх дыяспар за мяжой, якую ён узбудзіў у сакавіку. Цяпер **крымінальныя справы ўзбуджаныя супраць яшчэ 104 чалавек, якія ўдзельнічалі ў святкаванні Дня Волі 25 сакавіка 2024 г.** Супраць іх распачатая справа аб стварэнні «экстрэмісцкага фармавання» і дыскрэдытацыі Рэспублікі Беларусь. Пад пераслед у тым ліку патрапілі людзі, якія не знаходзяцца ў нейкай дыяспаральнай арганізацыі, а проста ўдзельнічалі ў мерапрыемстве. Пры гэтым Следчы камітэт называе святкаванне Дня Волі за мяжой «рэалізацыяй злачыннага плану збеглых лідэраў, які мае намер нанясення шкоды стратэгічным нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь па забеспячэнні незалежнасці, тэрытарыяльнай цэласнасці, суверэнітэту, непахіснасці канстытуцыйнага ладу». Паведамляецца, што на маёмасьць гэтых людзей будзе накладзены арышт.

У цэлым у эфіры дзяржтэлеканала прапагандысты адзначылі, што колькасць беларусаў, якія з'ехалі, у якіх улады арыштавалі і збіраюцца канфіскаваць нерухомасць, набліжаецца да 1000.

2. У жніўні стала вядома аб новай тэндэнцыі, звязанай з распараджэннем маёмасцю беларусамі, якія з'ехалі. Суд **ануляваў угоду аб продажы па даверанасці кватэры беларускі, якая з'ехала** і на якую была заведзеная крымінальная справа за «спрыянне экстрэмісцкай дзейнасці». Кватэра за 9 месяцаў да завядзення справы брат жанчыны прадаў яе бацьку. Жыллё арыштавалі.

3. Таксама працягвае якасна эвалюцыянаваць **ціск за ахвяраванні ў фонды**, які пачаўся у першай палове 2023 года і затым умацаваўся у першым трыместры 2024 г. Цяпер ён таксама **перакінуўся на тых, хто знаходзіцца за мяжой**. У маі стала вядома, што супрацоўнікі КДБ звяртаюцца ў IT-кампаніі ў Беларусі і просяць даць кантакты супрацоўнікаў, якія з'ехалі за мяжу, пасля звязваюцца з імі і просяць прыехаць у Беларусь для «кампенсацыі».

## ЧАРГОВЫ ВІТОК РЭПРЭСІЙ У ДАЧЫНЕННІ ДА ЛЮДЗЕЙ, ЗВЯЗАНЫХ З ДЭМАКРАТЫЧНЫМІ СІЛАМІ

У маі 2024 г. Следчы камітэт завёў крымінальную справу на ўсіх 257 чалавек, якія балатаваліся на выбары ў Каардынацыйную раду. Ім інкрымінуюцца: змова з мэтай захопу ўлады (арт. 357 КК РБ), заклікі да мераў абмежавальнага характару (арт. 361 КК РБ), стварэнне экстрэмісцкага фарміравання (арт. 361-1 КК РБ) і садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці (арт. 361-4 КК РБ). На маёмасць гэтых людзей на тэрыторыі Беларусі накладзены арышт.

# III. КЛЮЧАВЫЯ ЗМЕНЫ Ў РЭАКЦЫЯХ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР, ЯКІЯ ДАТЫЧАЦЬ СІТУАЦЫІ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ

## ПАЎТОРНЫ ЗАПУСК ВЕНСКАГА МЕХАНІЗМУ АБСЕ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА БЕЛАРУСІ

У ліпені 2024 г. па ініцыятыве 38 краін-членаў АБСЕ у адносінах да сітуацыі ў Беларусі паўторна быў запушчаны Венскі механізм. Першы раз у сувязі з падзеямі 2020 г. такі механізм быў запушчаны па ініцыятыве 35 краін-членаў АБСЕ ў лістападзе 2021 г.

Дзяржавы адзначаюць, што знаходзяць нездавальняльнай рэакцыю ўладаў на вынікі, прадстаўленыя ў справаздачы па другім Маскоўскім механізме (справаздача была прадстаўленая ў маі 2023 г., а сам Маскоўскі механізм паўторна быў запушчаны ў сакавіку 2023 г.). А таксама бачаць пагаршэнне сітуацыі за 11 месяцаў, якія прайшлі з моманту прадстаўлення гэтай справаздачы. У сувязі з гэтым у рамках паўторнага запуску Венскага механізму да беларускіх уладаў звернуты шэраг пытанняў. Яны тычацца ўмоваў утрымання палітвязняў і іх магчымага вызвалення, патэнцыйнага пазбаўлення грамадзянства, ціску на сем'і палітвязняў і доступу ў месцы пазбаўлення волі прадстаўнікоў міжнародных арганізацый, у тым ліку МКЧК і прадстаўнікоў замежных дзяржаў.

Важна адзначыць, што рэальныя наступствы ад гэтых механізмаў АБСЕ у нашай сітуацыі можна канстатаваць толькі паводле вынікаў першага Маскоўскага механізма. Тады рэкамендацыі прафесара Бенедэка шмат у чым паслужылі асновай для заснавання спецыяльнай экспертнай місіі па Беларусі ў рамках ААН. Разам з тым, цяпер, улічваючы тэндэнцыю вызвалення палітвязняў, можна меркаваць, што дзяржаве будзе што адказаць на некаторыя з гэтых пытанняў.

**МЫ БУДЗЕМ УДЗЯЧНЫ ЗА ЗВАРОТНУЮ СУВЯЗЬ !**

ПІШЫЦЕ НАМ НА OFFICE@BELHELCOM.ORG